**Л. П. Завішаў**

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ ДЫСКУРС НА СТАРОНКАХ "НАШАЙ НІВЫ" З 1912 ПА 1915 ГОД

На сённяшні дзень ужо добра вядома, што "Наша Ніва" у час уласнага існавання з'яўлялася рухавіком беларускага нацыянальнага руху. Але яна, то бок газета, таксама з'яўлялася платформай для нацыянальнага дыскурсу, і абмеркавання безлічнай колькасці пытанняў, датычных беларусаў як нацыі, і пытанняў аб тым ці ўвогуле "маем мы права быць беларусамі". Асабліва актыўна дыскусіі пачынаюцца ў 1914 г.

Напрыклад, у выпуску ад 9.01.1914 задаецца пытанне "Чаму нам не даюць жыць?" а высновa робіцца наступная – пакуль народ не ўсвядоміцца нацыянальна, беларусамі і далей будуць маніпуліраваць як "Несвядомай, цёмнай масай". У гэтым жа выпуску, апублікаваны артыкул "Хто з намі, хто проціў нас" у якім ідзе размова аб тым, што зараз, калі беларускі нацыянальны і культурны рух развіваецца хутчэй і хутчэй з кожным днём, на беларусаў пачынаюць звяртаць увагу іншыя народы, як хаўруснікі, так і ворагі.

У выпуску ад 31.02.1914 г. апублікаван артыкул "Наша Праўда" у якім рэдакцыя сцвярджала, што беларускі народ надта доўга лічылі памерлым, але насамрэч ён жыў, і ўстамі сваіх лепшых сыноў змагаўся за ўласнае месца ў "кругу жывых і вольных" і што зараз настаў час яшчэ больш актыўна змагацца за гэтае месца.

7.03.1914 апублікаваны артыкул "Родная Мова" у ім падкрэсліваецца важнасць уласная мовы для кожнага народу, а асабліва народу беларускага. Лічаць там, што роднай мовай чалавека адарыў бог, і што сыны народу павінны любіць, шанаваць ды бараніць яе.

У нумары ад 27.03.1914 змешчаны артыкул "Па сваім шляху!" у якім беларусаў заклікаюць чытаць уласную літаратуры, да і далей працягваць ствараць літаратурныя творы на роднай мове.

У выпуску ад 06.06.1914 апублікаваны артыкул "А ўсё-ж такі мы жывем!" Падпісаны у канцы літарамі "І. Л." – вядома, Іван Луцкевіч – Янка Купала. У якім ен піша, што з усіх бакоў лічаць нас часткай сваёй краіны.

Такім чынам, літаральна амаль на кожнай старонцы ў "Нашай Ніве" прысутнічае нацыянальны дускурс у тым, ці іншым памеры. Асабліва калі гаворка ідзе пра 1914 год. З 1912 па 1913 год дыскурс значна менш актыўны, а ў 1915 г. ён знікае – замест яго нічога, акрамя ваеных навінаў. Верагодна, газета трапіла пад ваеную цэнзуру, і нацыянальны дыскурс прыбралі са старонак разам з беларускімі вершамі ды прозай.